**К. Купа**

## “Звязда” 20-х гадоў: пачатак гісторыі

Пачатак XX стагоддзя стаў кропкай адліку развіцця беларускага нацыянальнага друку. Сёння ніхто не сумняваецца, што дзве газеты - “Звязда” і “Савецкая Беларусь” - сталі не толькі значнай грамадска-палітычнай з’явай для краіны, але задалі напрамак канцэптуальнага развіцця ўсяго нацыянальнага друку. Яны і зараз з’яўляюцца флагманамі, якія паказваюць курс імклівага сучаснага жыцця Рэспублікі Беларусь.

Не кожны ведае, што першы нумар газеты “Звезда” (1917, 27 ліпеня (9 жніўня), арганізатарамі і першымі рэдактарамі якой былі М.В. Фрунзе і А.Ф. Мяснікоў, выйшаў на рускай мове.

“Звезду” 20-х гг. даследчыкі вызначаюць як бальшавісцкую газету прапагандысцкага тыпу. У савецкі час усе органы друку адводзілі сабе ролю настаўніка, што было ўвасоблена ў выразе *газета – калектыўны прапагандыст, агітатар і арганізатар.* Аўтар публікацыі выступаў як прадстаўнік органа друку, як частка сістэмы, а выданне як сродак партыйнага кіраўніцтва грамадствам. Партыйныя органы пастаянна сачылі за тым, каб у СМІ не крытыкаваліся партыйныя работнікі, бо гэтая крытыка пераносілася б на ўсю КП, а значыць, і на ўсю гаспадарчую, сацыяльную і культурную палітыку, якую яна праводзіла.

У першых нумарах газеты аналізаваліся рэвалюцыйныя падзеі, тлумачыліся пытанні развіцця краіны пасля рэвалюцыі, змяшчаліся матэрыялы бальшавісцкіх з’ездаў, канферэнцый і пленумаў. Аднак Часоваму ўраду не падабалася прапаганда рэвалюцыйных ідэй, стратэгіі і тактыкі бальшавіцкай партыі, таму газета “Звезда” была 24 жніўня 1917 года закрыта. З 15(28) верасня па 06 (19) кастрычніка 1917 г. газета выдавалася пад назвай “Молот” А.Ф. Мяснікоў так ацэніў дзейнасць “Молота”: “Работа яго была чыста сакрушальная…“Молот” няшчадна знішчаў і адкідваў усё старое, непатрэбнае” (В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. Мн., 1957. С.31). З

08 (21) кастрычніка па 29(11) кастрычніка (лістапада) 1917 г. выданне аднолена пад назвай “Буревестник”. Газета ў тыя дні рашуча выступала пад лозунгам перадачы ўсёй улады Саветам. “Мы не представляем демократической республики без Советов. Советы будут нашей властью на местах. Республика Советов – наша цель”. (Буревестник, 1917, 26 окт.)

З 1 (14) лістапада 1917 г. газета выйшла пад першай назвай “Звезда”. Рэдакцыя аператыўна інфармавала чытачоў аб становішчы ў краіне, асвятляючы падзеі з пазіцыі ўлады. Так, кожны нумар газеты быў пранізаны ідэяй аб’яднання рабочых і сялян вакол бальшавіцкай партыі. Ключавым пытаннем, якое ставілася газетай, была барацьба супраць ворагаў савецкай урады.

З 1920 года рэдакцыя газеты вырашыла падняць праблему аднаўлення народнай гаспадаркі. “Белоруссия, как известно, является, по преимуществу, областью сельскохозяйственной” (1923. 2 дек.) – сцвярджала газета. Аб імкненні сялянства да новага землеўладкавання і павелічэнні пасяўных плошчаў, гаворыцца ў артыкуле “Состояние белоруской деревни” (1923. 18 кастр.). У гэты перыяд рэдакцыя стала адтрымліваць больш пісем ад вясковых актывістаў друку. Аддзел “Местная жизнь” у “Звезде” цалкам запаўняўся лістамі, нататкамі, карэспандэнцыямі сялян і салдат. На той перыяд з газетай ужо супрацоўнічалі палітыкі, вучоныя, літаратары і публіцысты. За кошт гэтага падняўся мастацкі і змястоўны ўзровень матэрыялаў, а на старонках газеты павялічылася колькасць аналітычных жанраў.

“Звезда” імкнулася станоўча ўплываць на чытацкую аўдыторыю, мадэлюючы паводзіны ў сям'і без гвалту і насілля, аднак ў сваім ідэалагізаваным разуменні – без рэлігіі: “Уничтожена водка. Наполовину убито влияние церкви. А семейные расправы все еще живы. Правда, число их сократилось, но иногда они все ещё вырываются наружу” (Зв. 1923. 18 окт.). У нумары ад 6 верасня 1923 г. “Звезда” паведамляе пра тое, што пры газеце створаны аддзел “Среди детей” і звяртаецца з просьбай прысылаць

карэспандэнцыю аб жыцці і вучобе маладога пакалення. “Дети – наше будущее. Здоровые дети – краса и гордость народа. Забота о детях – есть долг всего трудового народа” (1923.18 март.) – гэтыя словы становяцца лозунгам савецкага часу.

Усе матэрыялы газеты мелі антырэлігійную накіраванасць. Пачатак 20-х стаў і пачаткам разбурэння рэлігійнай культуры: “Будем жить по законам не божеским, а пролетарским” (1923. 7 апр.). Газета праз выкарыстанне імператыўнай інтанацыі актыўна ўплывала на мысленне людзей, з мэтай “усилить свою антерелигиозную работу” (1923. 1 март.) сярод народа.

У тагачаснай “Звездзе” паняцце культуры было цесна звязана з паняццямі барацьба, жыццё, праца: “Под культурой и новым бытом надо понимать борьбу за все те изменения в сознании и быту, нравах, привычках и навыках рабочего, которые необходимы для создания из него просвещенного, деятельного и культурного производителя и гражданина Советской страны... Нам нужна культура в работе, культура в жизни, культура в быту” (1923. 16 окт.). З сярэдзіны 20-х гадоў пачалася рэвізія зместу нацыянальнай культуры. Стваралісся новыя канцэпцыі гісторыі Беларусі, у якіх прыніжалася нацыянальная годнасць беларусаў. Гэта, у сваю чаргу, адбілася на сродках масавай інфармацыі, якія, з аднаго боку, адлюстроўвалі сацыяльную рэчаіснасць, з другога – уплывалі на характар яе развіцця і спараджалі адпаведны сацыяльны кантэкст. Аднак пераход газеты з 1925 года на беларускую мову пераўтварыў яе ў сапраўды нацыянальнае выданне.

Такім чынам, ля вытокаў развіцця нацыянальнага беларускага друку стаяла газета “Звязда”, якая на працягу ўсёй сваёй гісторыі карысталіся даверам чытачоў, з’яўляючыся сапраўды нацыянальнай па канцэпцыі і народнай па змесце. Выданне яе стала адной са значных падзей у гісторыі беларускага друку і аказала вялікі ўплыў на далейшае развіцце яго ў нашай рэспубліцы. І сёння яна з’яўляецца індыкатарам, які аператыўна рэагуе на ўсе з’явы і падзеі сучаснага беларускага жыцця і нясе інфармацыю на сваёй роднай мове.

**“Совецкая Беларусь”.** З’яўленне беларускамоўнай газеты “Савецкая Беларусь” можна лічыць кропкай адліку культурнага нацыянальнага адраджэння ў краіне. Першапачатковай задачай газета ставіла барацьбу за адраджэнне беларускага народа, за прызнанне самога факта яго існавання. На сваіх старонках яна заклікала да ўмацавання савецкай улады. Аб гэтым сведчаць і вершы, якія друкаваліся ў кожным нумары:

“Ня чуем ў працы змардаваньня
Мы –сіла грамады бязьлікай,
Валкі працы і змаганьня,
Сябры камуны мы вялікай.” ( “Хто мы?” Я.Журбы – 1921г. 16 вер.)

У той жа час “Савецкая Беларусь” шмат друкавала артыкулаў па гісторыі Беларусі, даказваючы неабходнасць развіцця беларускай мовы і літаратуры.

Амаль што з кожным нумарам газета расшырала свой кругагляд, дабаўляя пры гэтым новыя артыкулы: “Аб школах на Беларусі”, “Ахова мацярынства і младзенцтва на Беларусі”, “Хроніка беларускай культуры”.

За лік разнабаковага агляду аўтараў артыкулаў, чытачы пранiклі

А ў № 1000 на яе старонках былі надрукаваны думкі і пажаданні дапісчыкаў: “ Цяпер газета далёка ня тое,чымсь была ў пачатку 1922г. Цяпер чытаньне газеты – прыемны адпачынак пасьля працы. Мяне ў ёй цікавяць аддзелы: “Як жыве наша вёска”, “Жыцьцё закардоннай Беларусі”, літаратурныя творы,а гэтак жа агульна-крытычныя нарысы і крытычныя разборы твораў беларускіх пісьменнікаў…” (М.Колас) Газету можна назваць ліберальнай, паколькі яна давала магчымасць аўтарам выказваць розныя меркаванні аб лёсе беларускага народа. Усё гэта садзейнічала выхаванню ў чытацкай аўдыторыі

патрыятычных пачуццяў. У той жа час газета імкнулася зрабіць найважнейшыя грамадска-палітычныя праблемы рэспублікі больш блізкімі і зразумелымі для кожнага чалавека і спрабавала знайсці шляхі іх вырашэння. Газета “Савецкая Беларусь” пастаянна вяла дыялог з чытачом, імкнулася да адраджэння нацыянальнай культуры. Выпускі газеты прапітаны тэмай свабоды і нацыянальнай самасвядомасці, што садзейнічала развіццю і ўзбагачэнню беларускай мовы.